З 7 існуючых на сельсавеце калгасаў толькі ў адным агрэмаджаны сродкі вытворчасьці, прычым камуністы Крыўленя і Шпленя самі свайё кулацкасьці не агрэмадзілі.

Пры ўліку аб'ектаў абкладаньня яны выяўлена ні адной кулацка-заможнай гаспадаркі. Цьвёрдыя заданьні па ўсім сельсавеце даны толькі 13 гаспадаркам і то па 1 цэнт. кожнай, у той-жа час плян па зборнагатоўках быў давядзены да сем'яў рабочых-чырвонаармейцаў, якія на зямлі не працуюць (Вар хуціна).

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы ў сельсавеце не распачата. Ніякай масавай работы сярод калгасьнікаў і бедняцкоў і серадняцкоў — аднаасобнікаў не праводзілася. Ні тэзісы, ні пастановы XVII партканфэрэнцыі не пра працаваны. Таксама бязьдзейнічаюць і камсамольская ячэйкі.

Бюро Старапароскага райкому партыі, заслухаўшы даклад аб становішчы Языльскай парт'ячэйкі, пастанавіла зняць з работы сакратара ячэйкі Місейчыка, абвясьціўшы яму і Шплені вымову. Пуцеяя і Крыўленя выключаны з радоў партыі.

Старапароская партарганізацыя павінна ўлічыць урокі Языльскай ячэйкі і мабілізавацца на больш рашучую барацьбу з кулакам і яго агентамі ў радах партыі.

(БЕЛТА).

Аб тэарэтычнай падрыхтоўцы партактыву

Пастанова Менскага гарадзкога камітэту КП(б)Б

Падаючы асаблівае важнае значэньне марксыцка-ленінскаму выкананьню партыйнага актыву, сакратарыят Менгаркому КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Арганізаваць для кіруючага партыйнага актыву (сакратароў партколектываў і ячэек КП(б)Б, дырэктароў прадпрыемстваў і старшынь ФЗМК) курсы з пракладзеньнем цыклю эканомічных, гістарычных, філясофскіх дысцыплін і курсаў партыйнага будаўніцтва.

2. Работу курсаў разьлічыць на 5 месяцаў, праводзячы заняткі (дзьвіньня) два разы ў месяц па 8 гадзін.

У дні заняткаў слухачы курсаў вызваляюцца ад работы на прадпрыемствах.

3. Даручыць культпрападу гаркому КП(б)Б разам з рэктарам Камвузу распрацаваць мэтадычныя ўказаньні і праграмы курсаў, а таксама забясьпечыць курсы кваліфікаванымі выкладчыкамі.

Персанальную адказнасьць за арганізацыю работы на курсах усклаці на тав. Грыцкевіча.

4. Работу курсаў распачаць 20-га лютага.

5. Даручыць сакратарам партколектываў і ячэек КП(б)Б так размеркаваць сваю работу, каб мець два дні ў месяц вольным для заняткаў на курсах.

Правільна арганізаваная брыгада павінна стаць асноўнай формай работы на лесазагатоўках

Дырэктывы аб пераводзе на брыгадны мэтад работы ня выкананы

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове ад 29 кастрычніка 1931 году «Аб свабжэньні гарадоў БССР апалам» прапанаваў: «Лесбеду і саюзу лесарэфрабочых забясьпечыць пераход да 1-га сьнежня 1931 году на менш 75 проц. усёй занятай на лесазагатоўках і лесавывазцы рабчужсіны на брыгадны мэтад работы». Як-жа выпаўнілі-ж гэта важнейшае мерапрыемства? Паводле даных Лесбеду, на 20 лютага 1932 году на ўсіх лесапрамгасах БССР брыгадным мэтадам ахоплена усяго 33,8 проц. лесарубаў і 5,9 проц. возчыкаў.

У Асіповіцкім лесапрамгасе пераведзена на брыгадны мэтад лесарубаў 18,6 проц., возчыкаў — 15 проц. Баразінскім — лесарубаў 11,6 проц., возчыкаў — 5,2 проц.; Бабруйскім — лесарубаў — 21.6 проц., а з возчыкаў ні адной брыгады не арганізавана.

Чым жа можна вытлумачыць такое несамавітае становішча з выкананьнем пастановы ЦК КП(б)Б? Перш за ўсё тым, што, ні Лесбед, ні лесапрамгасы на месцах пытаньнем арганізацыі працы на лясных работах дагэтуль ніяка, як сьлед, не займаюцца.

Работнікі некаторых лесапрамгасаў нават і па сёменні дзень не разумеюць сутнасьці брыгаднага мэтаду работы. Барысаўскі лесапрамгас у вестках аб колькасьці брыгад да апошніх увесь час адносіў простыя арцелі лесарубаў, якія нічога агульнага з працаўнічай-арганізаванымі брыгадамі ня маюць. Пры праверы арганізацыі працы ў гэтым лесапрамгасе аказалася, што 50 проц. рабочых, аднесеных брыгадным мэтадам, як гэта паказана ў вестках, аказалася толькі 10 проц.

Пельна прайсьці мімо таго факту, што ў радзе месц, брыгадны мэтад, як асноўная форма работы, яўна недацэньваецца і нават ігнаруецца. Так, прарабы Тальпінскага і Брацлаўскага вучастка і Асіповіцкага лесапрамгасу, на правяку ўсяго часу ўзяра та сутрацўляліся ажыцьцяўленьня пастановы ЦК КП(б)Б «мастыцкуты», што нібы брыгадны мэтад зьяўляе прадукцыйнасьць працы. Гэтыя апартуністычныя разважаньні ўплывае рад бацюцца практыкай укараненьня работы правільна арганізаваных брыгад лесарубаў і возчыкаў. Досыць з Магілева і Жлыкіна, якія абвыя перагуканы «Зьвязьдзе», паказам пацьвярджаюць усю неўрэнтаванасьць такіх разважаньняў.

Необходна, апрача шырокай растлумачальнай работы вакол значэньня брыгаднага мэтаду, канкретная дапамога лесапрамгасам з боку вытыпуту працы лясной прамысловасьці.

Усякія апартуністычныя разважаньні аб «немагчымасьці ўкараненьня і сэнпрыгодасьці» брыгаднага мэтаду павінен быць дан вынічальны адпор.

Упартая штодзённая работа [illegible] пачыць поўнае выкананьне [illegible] вы ЦК КП(б)Б.

Няма функцыянальнага разьмеркаваньня працы

РЭЧЫЦА. (Наш кар.). Арганізацыя працы лесарубаў і возчыкаў у Рэчыцкім лесапрамгасе пастаўлена зусім дрэнна. Брыгадным мэтадам ахоплена толькі 23,9 лесарубаў. Што ж чыць возчыкаў, цяк сярод іх брыгадны мэтад работы зусім ня ўкараняецца.

Усяго па лесапрамгасе арганізавана 57 брыгад. Але яны па сутнасьці, нічым не адрозьніваюцца ад простых арцелей, бо ўнутры іх адсутнічае разьмеркаваньне працы па функцыях. У выніку абязьлічка ў рабоце і ўраўнілаўка ў зарплаце лесарубаў поўнасьцю яшчэ ня зьніклі.

Асабліва дае сябе адчуваць абязьлічка ў рабоце лесапрамгасаўскага транспарту. Коні, сані і ўся збруя за рабочымі возчыкамі не замацаваны. У выніку адбываюцца амаль штодзённыя зьмены, што вельмі дрэнна адбіваецца на правільным догляде транспарту. Памяшканьне для сушні збруі адсутнічае, што цягне за сабой псаваньне.

Пачаўша лесапрамгасам былі праведзены месячныя курсы падрыхтоўкі брыгадзіраў у колькасьці 70 асоб. Але 50 проц. курсантаў скарыстоўваюцца не па прызначэньні — яны працуюць радавымі лесарубамі і возчыкамі.

Матар'яльна-бытавыя ўмовы, асабліва жыльлёвыя, пастаянным работнікам вельмі дрэнныя. Досыць месцы, дзе ў адным пакоўчыку жывуць па 40 чалавек. Будаўніцтва жыльлёвага дому, якое распачата яшчэ ў кастрычніку 1931 году, да гэтага часу ня скончана.

Не заахвочваецца лепшая работа

Самай лепшай брыгадай на ўдарнай працы ў лесе Нахаўскага вучастку (Мазырскі лесапрамгас) зьяўляецца брыгада тав. Шукава. Увесь працэс работы брыгады разьмеркаваны па асобных функцыях (валка, распілоўка і г. д.). Брыгада заўсёды перавыконвае свае нормы. Прагулы і спазьненьні поўнасьцю ліквідаваны.

Трэба адзначыць, што кіраўніцтва вучастку вельмі мала зварачае ўвагі на ўдарную работу брыгады. У выніку апошняя дрэнна забясьпечваецца прадуктамі. Адсутнічае аптэчка. Лазарэтка ваят не забясьпечыў брыгаду кубкамі для піцьця гарбаты.

Вальчык.

Ударная работа брыгады тав. Піцукова

У выніку шырока разгорнутай масавай работы вакол лесазагатоўчай кампаніі калгасы «АДРАДЖЭНЬНЕ», «КОЛАС», ІМЯ XVI ПАРТЗЬЕЗДУ і «ЛЕНІНСКАЯ ПРАЎДА», ГАРАДЗІШЧАНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ (Магілеўскі раён) па-баявому праводзяць ударную работу па вывазцы дроў і лесу. У гэтых калгасах арганізаваны пастаянныя абозы, якія разьбіты на пасобныя брыгады. Выхадзілы з колькасьці фурманак, кожная брыгада дае заданьне. Помік брыгадамі разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Асабліва паказвае ўзорныя прыклады работы брыгада т. ПІЦУКОВА Ягора з калгасу «Колас». Вось вынікі яе работы. Брыгада складаецца з 10 фурманак. Дзённае заданьне на вывазцы 301 кбм. не адлічваючы 4 кбм. да пуньту яна выканала за тры дні з перавышэньнем на 30 кбм. Гэтых пераможцаў брыгада дабіваецца перш за ўсё дзякуючы добраму кіраўніцтву і прыкладнай рабоце самога брыгадзіра. Пры абмеркоўні заданьня на сьцюрчай нарадзе тав. Піцукоў упёўнаў прапанову, каб нормы дзень рабіць па 6 рэйсаў. Хаця чаго ны брыгады настойвалі на 5 рэйсах, але калі брыгадзір першым паехаў у 6-ты рэйс, дык яго прыкладу пасьледавала ўся брыгада.

За ўдарную работу па песавывазцы брыгада прэміравана прэмтаварамі.

ВЫЯЗНАЯ РЭДАКЦЫЯ «КАМУНАР МАГІЛЕЎШЧЫНЫ»: Прахарэнка, Говараў, Яскевіч.

„Очковтирательство" лапіцкіх лесазагатоўшчыкаў

Да стуценя 1932 году ў Лапіцкім вучастку, Асіпавіцкага лесапрамгасу на лесазагатоўках не працавала ні адной брыгады лесарубаў. Кіраўніцтва вучастку займалася «очковтирательствам». У афіцыяльных паведамленьнях аб колькасьці брыгад давалася пяпраўдзівыя весткі (усе простыя арцелі і «пары» лесарубаў паказвалі як брыгады).

У стуценя пры дапамозе работнікаў інстытуту працы было арганізавана 5 брыгад, якія з першых-жа дзён сваёй работы паказалі ўсю неабходнасьць і карысьць брыгаднага мэтаду. Брыгада Шкутко Канстантына амаль кожны дзень перавыконвала сваю норму ў сярэднім на 70 проц.

Здавалася-б, што работніцы вучастку павінны былі шырока пагуляць гэтыя ўзоры працы. Аднак, гэтага ня зроблена. Ня толькі ня створены новыя брыгады, але і арганізаваныя, як сьлед не замацаваны. Больш [illegible] абвешаны ў арцелі, што параджае ўраўнілаўку ў зарплаце і абязьлічку ў рабоце. Трэба адзначыць, што работнікі таксама не займаюцца арганізацыяй працы лесарубаў.

Д. М.

САЦСПАБОРНІЦТВА ВЁСАК НА ЛЕПШУЮ ВЫВАЗКУ

ПОЛАЦАК. (Наш кар.).

Полацкі лесапрамгас і саюз лесарабочых мабілізавалі свае лепшых работнікаў на правядзеньне шырокай масавай работы па калгасах. Раённая газэта выпусьціла пматтыражку і кіравала на найбольш буйных вучасткі выхныя рэдакцыі.

Калгас імя Огалімка, Юраўшкага сельсавету, заключыў з Палатоўскім вучасткам умову на вывазку 1.000 кбм. лесаматэрыялаў. Але праўленьне калгасу ня выканала гэтай умовы. Сход калгаснікаў, які нядаўна адбыўся, прызнаў работу па вывазцы лесу незадавальняючай і вылучыў 40 фурманак з такім разьлікам, каб да 15 красавіка поўнасьцю выканаць сваё заданьне ў 1.000 кбм. Калгаснікі склалі 4 ударныя брыгады, якія заключылі паміж сабой дагавары на лепшае выкананьне пляну вывазкі.

Калгас імя Дзяржынскага, Сямяжэвіцкага сельсавету, абавязаўся штодзённа пасылаць у лес ня менш 40 фурманак, складзены 4 брыгады; выкліканы на сацспаборніцтва калгасы «Труд», Вазроніцкага сельсавету і «Чырвонае Абсалоньне», Тураўлянскага сельсавету.

Дротуньскі вучастак. Арлейскага сельсавету выклікаў на сацспаборніцтва аднаасобнікаў вёсак Палучча, Гарукі і Асоцы, Малаітинскага сельсавету і в. Папурыцы, Алесфоскага сельсавету. Вёскі выклік прынялі. На другі дзень яны выслалі ў лес 40 фурманак. Вёска Папурыцы выслала сустрэчны плян у 200 кбм.

Па Белямацейскім вучлесапрамгасу, паводле ініцыятывы ўдарніцы Барановіцкай, арганізаваны 2 ударныя брыгады жанчын, якія ў лясных работах зусім не адстаюць ад мужчын.

А. Шустрэ.

Няма бальшавіцкай настойлівасьці ў разгортваньні ільназагатовак

ГОРКІ — адзін з буйнейшых ільнаводчых раёнаў у БССР. 1.500 тон ільнавалакна — базная праграма ільназагатоўчай кампаніі гэтага году. Раённае партыйнае кіраўніцтва, улічваючы, што даны Наркамзнабам плян мінімальны, зусім правільна зрабіла, выслухаўшы сустрэчны, павялічыўшы плян з 1.150 да 1.500 тон.

Гэта абавязала раённыя арганізацыі разгарнуць вялікую масавую работу, забясьпечыўшы поўнае выкананьне ўзятых на сябе абавязацельстваў. Аднак, на 20-га лютага замест 100 проц. плян загатовак выказана толькі на 41,5 проц. (пляну Наркамзнабу) і 32 проц. мясцовага пляну.

Рэальнасьць пляну яшчэ раз пацьвярджаецца тым, што Наркамзнаб БССР свой плян акрэсьліў у 1.4 цэнт. ільнавалакна з гектара. Па сустрэчным плане раённай арганізацыі працягнецца 1.8 цэнт. з гектара, у той час, калі пробленая сёлета самога раёну экспэртыза ўстанавіла сярэдні ураджай з гектара ў 2,27 цэнт.

Адсутнасьць апрацыйна-масавай работы, разважаньні і дакладзіцы замест канкрэтнага кіраўніцтва, слабая барацьба з кулацка-спэкулянцкай тэндэнцыяй у калгасах — вось тым асноўным прычыны, якія прывялі работу да такіх ганебных результатаў.

Калгасны сэктар павінен даць больш 70 проц. пляну. Рад перадавых калгасаў — «Завет Ільліча», імя Варашылава і інш.—на аснове зьдзельнічыны і правільнай арганізацыі працы датрымова выказалі плян зачы працыцыі. Аднак, калгасны сэктар у цэлым на 20-га лютага зрабіў толькі 51 проц. пляну.

Парціяпатчатковую апрацоўку ільну калгасы сустрэлі непадрыхтаванымі. У большасьці калгасаў нават зараз няма плянаў перапрацоўкі ільну, не ганцаваны ўжо аб кантрольных і калькуляцыйных тэрмінах.

Адставаньне калгаснага сэктару тлумачыцца, галоўным чынам, тым, што гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў на стала цэнтральнай задачай раённай арганізацыі. Фармальна, паводле дзіцяк раённых арганізацыяў, усе калгасы пераведзены на зьмешаны, а не спрасе ў разе калгасаў ісіне надзейнічыла, мержай зьяўляецца палатка (прападзень) неадлежна ад выказанай калгаснікам працы. Ураўнілаўка, абязьлічка — вось што характарызе для значнай часткі калгасаў раёну.

Пастаянныя брыгады па перапрапоўцы ільну не арганізаваны. Прыкладныя нормы Калгасцэнтру БССР у значнай частцы калгасаў сказалопна. У калгасах Парпынскага сельсавету нормы зьніжаны ў сярэдзіне на 40-50 проц. Нікольні ніякі ўзгаднёнасьці нормы, сьвідчаць факты, што ў разе калгасаў — «Адказ інтэрнэцтам», «Завет Ільліча», імя Варашылава і інш. — прыкладныя калгаснікі ў сярэдзіне у 1½-2 разы перавыконваюць іх.

Слабая барацьба з кулацка-спэкулянцкімі тэндэнцыямі зьяўляецца адной з прычын адставаньня калгаснага сэктару. У той час, калі большасьць калгасаў і калгасны сэктар у цэлым дадзна ня выказалі свае абавязкі перад дзяржавай, ёсьць масавыя факты разбазарваньня, разьмеркаваньня ільну пры ўсякім прычыны выпадку (на ніўні, на мяшкі і г. д.). Прыцым амаль у кожным калгасе лён разьмяркоўваецца розна: на працадзень, на двор, на гектар і інш. У калгасах «Адказ інтэрнэцтам», «Новы сьвет» і інш. лён быў разьмяркоўвай яшчэ ў часе ўборкі, прычым радзілі па 5 вазонак на адну калгаснічку. Разбазаравальнае ільну часта ішло пад кіраўніцтвам пасобных раённых работнікаў. У калгасе «Вясёлае жыцьцё» быў разьмяркоўвай амаль поўнасьцю ўраджай ільну, пры тым з узелам і пад кіраўніцтвам інструктара райкалгасаюзу Цыкуноўа. Па ініцыятыве гэтага-ж «інструктара» ў калгасе «Сакрэлім» скарыстана на подсыпі кілька колькасьць ільну, з прычыны таго, што Цыкуноў заявіў, што гэты лён нібыта нявыгодна апрацоўваць, а больш экаёмна на скарыстаць яго на подсыпі. Раённае кіраўніцтва не магло на ведаць аб фактах разьмеркаваньня ільну, якія мелі месца яшчэ ўвосень. Іменна адсутнасьць барацьбы з гэтымі шкоднікамі тэндэнцыямі прывяла да таго, што разбазаравальнае ільну набыло масавы характар. У розе калгасаў («Адказ інтэрнэцтам», «Чырвоны Кастрычнік» і інш.) значная колькасьць ільну знаходзіцца пад сьнегам.

Кіраўніцтва земельна-калгасных раённых арганізацыяў, у прыватнасьці, загатоўчых, перапрацоўчай і загатоўкай ільну ў большасьці зводзіцца да гаспрадзёрства і зьбіраньня зводак. Райкалгасаюз і МТС на ведаюць сапраўдных прычын адставаньня калгасаў. Даволі ўказаць, што ўпаўнаважаны райкалгасаюзу Тарасенка, пабываўшы за некалькі дзён у Чарнушскім і Жданоўскім сельсаветах і пасьпяўшы перакінуць у Парпынскай, ніяк не змог асьвятліць становішча загатовак ільну на сельсаветах, у якіх ён быў. Пры колькім сельсавеце ёсьць упаўнаважаны работу, а ў пасобных — нават два. Роля гэтых упаўнаважаных вельмі вялікая. Аднак, упаўнаважаны часта прыяжджаюць у сельсавет, не выяжджаюць у калгасы і, сабраўшы весткі, хутка едуць назад. На справе сельсаветы і калгасы не атрымліваюць належнай дапамогі ў рабоце.

Зусім выпадкі з-пад увагі раённых арганізацый аднаасобны сэктар і кантрактацыя. У гэтым годзе ўвесь насеў ільну быў закантрактаваны. Здавалася, што гэта абавязвае рабіць быць у радах першых. На справе-ж раённыя арганізацыі зусім забыліся, што ёсьць кантрактаваны, што праба весьці жаркую работу, што, напрыклад, маюць зусім выразныя і ясныя ўказаньні абавязацельствы. У выніку адсутнасьці работы сярод кантрактантаў на 20-га па аднаасобным сэктары, у тым ліку і па цьвёрдых заданьнях, плян выказан толькі на 25 проц.

Раённыя загатоўчыя арганізацыі — райкалгасаюз і інш. — аказалісь ня толькі не арганізатарамі ільназагатовак, але нават і дрэннымі прыёмшчыкамі. Прынят часта ад калгаснікаў недатрапаны лён. Загатоўчыя арганізацыі не арганізавалі пры прыёмачных пунктах дитрошку ільну з мэтай прывядзеньня яго ў вышэйшы нумар. Ёсьць рад фактаў, калі загатоўчыкі з мэтай сакастрахоўкі вызначаюць лён на ½-1 нумар ніжэй сапраўднай каштоўнасьці. Бываюць выпадкі, калі ў прынятай кудзелі знаходзіцца значная колькасьць годнага прамыловага ільну. Аднак, загатоўчыкі лічаць непатрэбным рабіць выбарыт тобрага ільну, звалваюць ўсё ў кучу, запосячы яго ў графу «кудзеля».

Значным стымулам для ўзмацненьня ільназагатовак зьяўляецца прэміраваньне ільнаапатчыкаў. Аднак, у Горацкім раёне гэтаму важнейшаму рэпрэмыемству не аддаецца ўвагі. На гледзячы на тое, што ў раён завезены дэфіцытныя тавары, як мыла, абутак, адзеньне, трыкатаж, мануфактура, хусткі і інш., у сярэдзіне 80-90 проц. пляну, прыпадаючага для прыёмаваньня ільназагатчыкаў, па месцах у спажыўтаварыствах сакаль зусім адсутнічаюць тавары для прыёмаваньня.

Пад выглядам разбазаваньня, тавары, прызначаныя для ільназагатовак, скарыстоўваюцца не па прызначэньні. Напрыклад, на 3.000 руб. трыкатажу было прадана ў горадзе, не дайшоўшы нават да сельскага спажыўтаварыства. Паводле заявы кіраўніка райса

Да ўсебеларускага зьезду агра-зоатэхнічных работнікаў

МАБІЛІЗАВАЦЬ МАСЫ НА РЭАЛІЗАЦЫЮ ДАСЯГНЕНЬНЯЎ АГРАНАВУКІ

Усяму цэнтральнаму і раённаму друку БССР

5-га сакавіка склікаецца ўсебеларускі агразоатэхнічны зьезд. На зьезд рокладаецца адказнейшая задача — мабілізаваць агрэспэцыялістаў на поўнае ажыцьцяўленьне пастаноў партыі аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, мабілізаваць масы на барацьбу за высокі ўраджай, за высокую таварнасьць гаспадарак, намецець канкрэтныя мерапрыемствы па ўдасконаленьні агра і зоатэхнікі ў калгасах і саўгасах на 1932 год.

Таму як цэнтральны, так і раённы друк павінны максымальна скарыстаць готы тэрмін для падрыхтоўчай работы, папулярызацыі пытаньняў, што будуць выношацца зьездам, для пастаноўкі на старонках друку цэлага раду праблем, якія маюць актуальнае значэньне ва ўмовах БССР у барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці, мабілізуючы найшырэйшыя масы на выкананьне гістарычных пастаноў XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б.

Масы, як мага хутчэй павінны заўладаць агратэхнікай, перанесьці жыцьцёвы вопыт з інстытутаў і дасьледчых станцый у калгасы і саўгасы, даць папулярную агратэхнічную літаратуру; перайсьці ад слоў аб агратэхніцы да канкрэтных баявых дзеяньняў па ўжываньні агратэхнікі — вось выходны пункт для друку на ўсёй падрыхтоўчай рабоце да зьезду.

Канкрэтна неабходна правесьці наступнае:

1. Зьмясьціць на старонках друку рад артыкулаў: аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў [illegible] на брыгаду, зьдзелічыну, улік [illegible]трэль, на вылучэньне і выка[illegible]не калгаснага алтыну), аб ты[illegible]вых сеязваротах па асобных спэцыялізаваных гаспадарках, хамбазы і клубы (асабліва вапрацаваны), селекцыі, тэрмінах сяўбы, захаваньні азімых ад вымаклі і выправаньня, аб удасконаленьні ўраджайнасьці тэхнічных культур, стварэньні кармовай базы, барацьбе з шкодачнымі, механізацыі сельскай гаспадаркі і г. д.

2. [illegible] арганізаваць на старонках друку выступленьні (як калектыўныя, так і не калектыўныя), агрэспэцыялістаў інстытутаў і дасьледчых станцый, зямельна - калгасных органаў, якія б пастаўлі перад зьездам рад як праблемных, так і канкрэтных пытаньняў па асобных галінах сельскай гаспадаркі: арганізацыі працы, механізацыі і электрыфікацыі, удасконаленьні ўраджайнасьці тэхнічных культур, разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі і інш.

3. Арганізаваць выступленьні жывёлагадоўчых, ільнаводчых, плодаводарскіх калгасаў і саўгасаў з патрабаваньнямі і канкрэтнымі прапановамі да агратэхнічнага зьезду. З сёньняшняга дня ініцыяваць асьвятленьне вопыту лепшых саўгасаў і калгасаў у барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці, удасконаленьне працэсыўнасьці жывёлы, аўладаньне агразоатэхнікай.

4. Па старонках нізавога саўгаснага і калгаснага друку, а таксама і цэнтральных газэт неаслабна распачаць збор рацыяналізатарскіх прапаноў ад калгасьнікаў-ударнікаў, рабочых саўгасаў, брыгадзіраў, аграномаў, зоатэхнікаў, як лепш на ўмовах таго ці іншага калгасу і саўгасу ўжыць агратэхнічныя мерапрыемствы ў часе веснавой сяўбы ў мэтах атрыманьня большай ураджайнасьці. Дабіцца, каб у кожным калгасе і саўгасе была кніга агратэхнічных прапаноў. Сачыць за тым, каб кожная каштоўная прапанова абгаварывалася на вытворчай нарадзе, а потым ажыцьцяўлялася ў практычнай рабоце.

5. У адзнаку зьезду мабілізаваць найшырэйшыя масы калгасьнікаў і рабочых саўгасаў на хутчэйшую ссыпку насеньных фондаў, ачыстку і пратручваньне насеньня, правядзеньне гатунковага абмену насеньня, вывазку са станцый мінэральнага ўгнаеньня, вывазку гною на палі, выпрацоўку сеязваротаў, падрыхтоўку і захаваньне каня да вясны і г. д.

6. Ва ўсёй падрыхтоўчай рабоце да зьезду падкрэсьліць вялізарную арганізуючую ролю МТС, як арганізатараў калгаснай вытворчасьці і вялікіх фактараў па перавыхаваньні калгасных мас, ператвараючы МТС у сапраўдных арганізатараў калгаснай вытворчасьці, барацьбы за высокі ўраджай, узьнаньня прадукцыйнасьці калгаснай працы. Задача партыйных арганізацый — «усямерна ініцыяцыю дапамогу машына-трактарным станцыям, у асаблівасьці ў справе ўмацаваньня кадраў і ўмацаваньне кіраўніцтва ўсёй гаспадаркай работай МТС» (з пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага 1932 г.).

7. Разгарнуць паміж нізавым і раённым друкам сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае правядзеньне падрыхтоўчай работы да агратэхнічнага зьезду і асьвятленьне ходу работы самога зьезду. Пасакалічкам пірмыншства павінны зьяўляцца: лепшыя прапановы да зьезду, поўнае ажыцьцяўленьне агратэхнічных мерапрыемстваў у калгасах і саўгасах у часе веснавой сяўбы.

8. Цэнтральнаму друку больш поўна асьвятляць работу самога зьезду. БелТА неабходна распрацаваць план асьвятленьня работ зьезду ў раённым друку, выходзячы з дыфэрэнцыяванага кіраўніцтва: жывёлагадоўчымі, ільнаводчымі, плодагародніцкімі калгасамі.

9. Уся падрыхтоўчая работа павінна быць праведзена рэалізацыяй пастановы ЦК УсеКП(б) «аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, рэалізацыі 6 пост. пав. Сталіна, рэалізацыі пастаноў XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б. выходзячы з асаблівасьцяй асобных галін сельска-гаспадарчай вытворчасьці, высокіх і выхаваньні калгаснага актыву з лепшых ударнікаў калгаснай вытворчасьці, узьелічэньні сацыялістычнага спаборніцтва.

10. Абавязваем партарганізацыі безадкладна налажыць систематычны кантроль і праверку ва ўсёй падрыхтоўчай рабоце да зьезду па ўсіх галінах работы.

Сакратар ЦК КП(б)Б
ШАРАНГОВІЧ.

На барацьбу за ахову ўраджаю азімых

Барацьба за павышэньне ўраджайнасьці сацыялістычных палёў, на аснове далейшага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, сьцяляецца адной з важнейшых задач.

Барацьба са стратамі ў часе зімоўкі азімых ёсьць адно з мерапрыемстваў па павышэньні ўраджаю.

Ва ўмовах БССР пагібель азімых ад няспрыяючых умоў зімы здараецца даволі часта і прыносіць вялікія страты нашай сацыялістычнай сельскай гаспадарцы.

Можна лічыць, што з двух гадоў у БССР адзін бывае вельмі няспрыяючым для зімоўкі азімых і дае значнае зьніжэньне ўраджаю, якое ў середнім для кожнага году можна лічыць у 750-800 тыс. цэнт. У наасобныя няспрыяючыя для зімоўкі гады страты ад пагібелі азімага збожжа бываюць значна большыя.

Галоўнейшымі прычынамі пагібелі азімых у БССР зьяўляюцца — выправаньне, вымаканьне пасеваў і стварэньня ледзяной скарынкі. Выправаньне бывае тады, калі з восені сьнег кладзецца на нямёрзлую глебу, якая і ў далейшым ня можа замёрзнуць пад сьнегавым акрыцьцём, калі на працягу зімы ці пад весну здараецца адтайваньне глебы, якая потым пакрываецца новым сьнегавым насьпілам. Таксама шкодным для рунь зьяўляецца празьмерна вялікае сьнегавое пакрыцьё, калі яно клазецца на слаба прамёрзлую, тым больш незамёрзлую глебу. Вялікую ролю ў пагібелі пасеваў пры выправаньні адыгрывае грыбок «сьнежная цьвіль» у тым выпадку, калі насеньне было заражана гэтым грыбком.

Вымаканьне збожжа здараецца тады, калі ўвосень на руні доўга застойваецца вада ў часе асеньніх дажджоў, або ўвесну ў часе раставаньня сьнегу, часамі ў середніне зімы.

Здараецца і вымаканьне ярыны, калі пасьля не сяўбы ад частых дажджоў на полі застойваюцца лужыны.

Ход зімы 1931-32 г. дае падставу лічыць, што азімыя культуры могуць за час зімоўкі паказацца значна пашкоджанымі і прынесьці гэтым самым вялікія страты народнай гаспадарцы БССР.

На працягу гэтай зімы мы ўжо мелі выпадкі поўнага раставаньня сьнегу, з прычыны чаго ў нізкіх частках поля стварэўся застой вады, што магло выклікаць вымаканьне. З другога боку, надыход марозаў у канцы студзеня пасьля гэтых адліг пакат у якіх выпадках выклікаў стварэньне на полі ледзяной скарынкі.

Прадбачачы гэту небясьпеку для зімоўкі азімых, Беларуская Акадэмія Навук склікала 5-6 лютага нараду спэцыялістаў, каб абгаварыць мерапрыемствы, патрэбныя для абароны ўраджаю азімых ад страт.

Парада ўстанавіла, што важнейшым момантам для зімоўкі азімых зьяўляецца належны падбор іх гатункаў, якія здольны добра пераносіць няспрыяючыя ўмовы зімы, якія ў нас здараюцца.

Напрыклад, «пяткускае» жыта выявіла сябе амаль вусім няпрыгодным для зімоўкі ва ўмовах БССР, асабліва ў зіму 1927-28 і 1930-31 г. г., калі яно ў некаторых мясцох амаль поўнасьцю загінула.

Побач з гэтым гатунак «Авангард» у гэтыя няспрыяльныя гады выявіў сябе, як устойлівы гатунак.

Каб папярэдзіць пагібель азімых за час зімы, які яшчэ застаўся, і за весну, трэба прыняць рад захадаў. У гэту вясну трэба шырока ўжываць спуск вады з пасеваў там, дзе яна можа затрымлівацца. Калі да веснавога часу здараюцца моцныя адлігі з раставаньнем сьнегу, трэба таксама не дапускаць застою вады на пасевах.

Для зьніжэньня ледзяной скарынкі перш за ўсё можна парэкамендаваць дыскаваньне.

Калі ледзяная скарынка тонкая, можна правесьці баранаваньне поля цяжкімі лугавымі баранамі.

Вясной пасьля таго, як растане сьнег, трэба зрабіць лёгкае баранаваньне азімых пасеваў (шпаніца, жыта, канюшына). Асабліва патрэбна баранаваньне на цяжкіх і западзістых глебах.

У справе зьмяншэньня страт у часе зімоўкі азімых вялікае значэньне мае валежнае правядзеньне агратэхнічных мерапрыемстваў. Таму ўжо з часу падрыхтоўкі поля пад азімыя неабходна зьвярнуць увагу на тое, каб стварыць найбольш спрыяючыя ўмовы для перазімоўкі азімых культур.

Ворыва папару трэба пачынаць як можна раней, зараз-жа пасьля скашэньня пасеву яравых. Па цяжкіх і западзістых глебах неабходна правесьці ваппаваньне поля пад азімыя. Апошняе перадпасеўнае ворыва рабіць не пазьней, як за 2-3 тыдні да пасеву азімых, з тым, каб глеба магла асесьці. У іншым выпадку, калі асядальне будзе адбывацца ў часе прарастаньня пасеваў, могуць абрывацца карэнчыкі.

Як правіла, неабходна рабіць радковы пасеў з паглыбокай жалелкай пасеньня каля 4-6 см.

Паколькі пры выправаньні вялікую ролю ў пагібелі адыгрывае грыбок сьнежнай цьвілі, трэба перад сяўбою рабіць абавязкова ачыстку і пратручваньне насеньня.

На цяжкіх глебах і вучастках, дзе няма добрага стоку вады, зараз-жа пасьля сяўбы трэба правозіць валаспускныя борозны, перапасеўнае ворыва карысна рабіць больш вузкімі загонамі.

Перад надыходам зімы палі з азімымі павінны быць агледжаны з тым, каб быў забясьпечан спуск вады праз борозны.

Асабліва вялікае і часамі рашаючае значэньне для зімоўкі мае тэрмін сяўбы азімых.

Добрая зімоўка азімых ва ўмовах БССР у значнай меры выкажае іх ураджай. Таму вакол пытаньня барацьбы з няспрыяючымі ўмовамі зімоўкі, на выкананьне вызначаных мерапрыемстваў трэба зрабіць увагу ўсіх рабочых саўгасаў, калгасьнікаў, беднякоў і серадняковаў—аднаасобнікаў — заўгаснікаў калгасьнікаў і ўсёй савецкай грамадзкасьці.

К.

1-я Усебеларуская партнарада па кадрах

25-га лютага ў Доме Калгасьніка адкрылася, скліканая ЦК КП(б)Б, 1-я ўсебеларуская партнарада па кадрах.

Нарада разгледзіць наступныя пытаньні: — Вынікі і задачы вырашэньня праблемы кадраў; аб становішчы і мерапрыемствах па падрыхтоўцы калгасных кадраў і падрыхтоўцы кадраў для тарфяной і будаўнічай прамысловасьці. Апрача гэтага нарада заслухае даклад аб барацьбе з шкодачнасьцю кіруючых кадраў і стварэньні рэзэрваў.

На вячэрнім пасяджэньні 25 лютага нарада заслухала даклады т. т. Кухаркіна (загадчык аддзелу кадраў ЦК КП(б)Б), Шапіра (Дзяржплян), аб выніках і чарговых задачах у галіне вырашэньня праблемы кадраў і аб кантрольных лічбах па кадрах на 1932 г.

Дакладчыкі падкрэсьлілі вялізарную важнасьць кадраў у справе вырашэньня далейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва, барацьбы за стварэньне бясклясавага грамадзтва.

— Наша задача заключаецца ў тым, — падкрэсьліў тав. Кухаркін, — каб забясьпечыць усе галіны і ў першую чаргу вядучыя галіны народнай гаспадаркі моцнымі, адданымі справе сацыялізму пралетарскімі кадрамі. Пытаньні барацьбы за якасьць кадраў барацьбы з бракам у кадрах павінны стаць баявымі задачамі работы ўсіх партарганізацый. Мы павінны забясьпечыць такую падрыхтоўку, каб спэцыялісты стаялі на ўзроўні сучаснай сусьветнай навукі і тэхнікі, каб ён ня толькі разумеў складанасьць і адказнасьць часу, у які жыве, а каб разам з рабочай клясай нага ў нагу, пад кіраўніцтвам партыі змагаўся за сацыялізм.

Т. т. Кухаркін і Шапіра падрабязна спыняюцца на вялізарных посьпехах, якіх дасягнула КП(б)Б у падрыхтоўцы пралетарскіх кадраў для прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. Беларусь, у мінулым прыгнечаная і няпісьменная, становіцца краінай сацыяльнай цісьненасьці, краінай, якая мае дзесяткі ВНУ і навукова-дасьледчых інстытутаў, сотні тэхнікумаў і тысячы пачатковых школ.

Тым ня менш, дасягнутыя посьпехі не даюць права зьнізіць тэмпы барацьбы за пралетарскія кадры. Цяперашні этап сацыялістычнага будаўніцтва патрабуе вялізарнай арміі кваліфікаваных рабочых, брыгадзіраў-кіраўнікоў калгаснай вытворчасьці, спэцыялістаў як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы.

На раніцішнім пасяджэньні 26 лютага разгарнуліся шырокія спрэчкі по абгаварэньні дакладаў т. т. Кухаркіна і Шапіра. У спрэчках выступілі т. т. Хаўкін, Шаймаў, Гурэвіч, Амосаў, Шалапёнак, Тарасевіч, Галуб, Васьцюк, Ісаенка, Мятла, Белаўсаў, Крывіцкі, Ашак, Лысоў і інш.

На вячэрнім пасяджэньні 26 лютага з дакладам аб падрыхтоўцы калгасных кадраў выступіў тав. Міцкоў.

На гэтым-жа пасяджэньні нарада заслухала даклад тав. Карпакевіча аб падрыхтоўцы трактарыстаў у сувязі з задачамі арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Пасьля дакладу тав. Карпакевіча нарада заслухала паведамленьні аб падрыхтоўцы калгасных кадраў: бабруйскага райкалгасаюзу, калгасу «Камбайн» (Слуцкі раён), калгасу імя Калініна (Цераханскі раён, саўгасу імя Варапылава (Лёзьнянскі раён) і інш.

На раніцішнім пасяджэньні 27-га лютага разгарнуліся спрэчкі па дакладах т. т. Міцкова і Карпакевіча.

Фабрычна-заводзкі друк БССР уключаецца ў сталінскі паход

9 ЗЬЕЗД ПРАФСАЮЗАЎ БССР АДЗНАЧЫМ ВЫКАНАНЬНЕМ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕМ ПРАМФІНПЛЯНУ

Абвешчаны «Зьвяздой», ЦСПСБ і «Рабсельпокорам» усебеларускі сталінскі паход-спаборніцтва нізавога фабрычна-заводзкага друку і рабкораў на лепшую работу па рэалізацыі 6-ці умоў тав. Сталіна знайшоў жывы водгук на фабрыках і заводах Барысава. Рэдакцыя газэты «БАЛЬШАВІК БАРЫСАЎШЧЫНЫ» 25 лютага ўключылася ў правядзеньне ўсебеларускага сталінскага паходу і наведала практычныя мерапрыемствы па яго правядзеньні. Райком КП(б)Б у спэцыяльнай пастанове аб правядзеньні сталінскага паходу на фабрыках і заводах Барысава зазвярнуў увагу ўсіх фабрычна-заводзкіх партарганізацый на необходнасьці ўзмацненьня і практычнага кіраўніцтва паходам з боку ўсіх партарганізацый, заводзкіх парткамітэтаў і цэхавых-вузлавых парт'ячэек. У сваёй пастанове райком КП(б)Б прапанаваў заводзкім партарганізацыям уключыць у сталінскі паход нізавога фабрычна-заводзкага друку і рабкораў усю масу рабочых прадпрыемстваў, з тым, каб сапраўды пераатварыць паход у шматгэтычны рух рабочых мас за поўную рэалізацыю да зьезду прафсаюзаў 8 ужо т. Сталіна. Асобным пунктам пастановы райкому патрабуе вялікую увагу аддаць справе папулярызацыі і ажыцьцяўленьня пастановы XVII Усесаюзнай партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б.

Гэта пастанова райкому КП(б)Б павінна быць ператворана ў жыцьцё ўсіх фабрычна-заводзкіх партарганізацый Барысава ў іх рабоце па разгортваньні сталінскага паходу.

* * *

У сталінскі паход-спаборніцтва не сёньняшні дзень уключыліся шматтыражка, цэхавы друк і рабкоры «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНЫ», а тэхнічна шматтыражка дрэваапрацоўчага камбінату «УДАРНІК». На нарадзе рэдактароў шматтыражак і старшынь радзіцэлей насьцянгазэт аснорных прадпрыемстваў Барысава, якая была праведзена 25 лютага, абмеркаваны ўмовы і задачы паходу-спаборніцтва. Гарадзкім аператыўным штабам сталінскага паходу распрацоўваюцца практычныя мерапрыемствы па яго разгортваньні на прадпрыемствах Барысава.

* * *

Уключэньне ў сталінскі паход [illegible]ніцтва выклікала новую хвалю энтузіязму рабочых фабрыкі «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА» і «ПРАЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА». У адказ на абвешчаньне сталінскага паходу РАБОЧЫЯ ШЧАПАЛЬНАГА ЦЭХУ АРГАНІЗАВАЛІ ДЗЬВЕ НОВЫЯ ГАСПАДАРЧА-РАЗРАХУНКОВЫЯ БРЫГАДЫ.

* * *

РЭЧЫЦА. (Па тэлетрафу). Рэчыца ўключылася ў сталінскі паход фабрычна-заводзкага друку. Пры райвоенкаматы створан штаб па кіраўніцтву сталінскім паходам з представоўнікоў: райкому, «Рэчыцкай праўды», райпрофсавету і рэдактараў шматтыражак. Штабам распрацаваны падрабязны план дзейнасьці першага этапу паходу. Члены штабу прыкладваны да прадпрыемстваў. Прэзыдыумам райпрофсавету прапанавана ўсім фабзаўкомам уключыцца ў сталінскі паход. На прадпрыемствах разгортваецца масавая работа вакол задач, пастаўленых сталінскім паходам.

НОВІК.

Саўгасы „Насовічы", „Пачаевічы" і „Чэрыкаў" не падрыхтаваліся да захаваньня апарасаў

ЗАРПЛАТУ КОЖНАГА СЬВІНАРА, ЗОАТЭХНІКА і ВЭТДОКТАРА ПАСТАВІЦЬ У ЗАЛЕЖНАСЬЦЬ АД ГАДОЎЛІ МАЛАДНЯКА І ВЫХАДУ ТАВАРНАЙ ПРАДУКЦЫІ

100.000 цэнтнэраў таварнага мяса павінны даць саўгасы „Сьвінавода"

У заключным годзе пяцігодкі сьвіназадоўчыя саўгасы БССР павінны адгрэеліць 180.000 таварных сьвіней і даць пралетарскай дзяржаве на мяшы 100.000 цэнтн. таварнага мяса. Апошняе стадо саўгасаў да канца году трэба давесьці да 265.000 штук.

Фармаваньне стада саўгасаў і выкананьне прамфінпляну ў гэтым годзе цяжкае, галоўныя чынны, за які ўласнага прыплоду. Таму захаваньне маладняка, захаваньне зімовых і веснавых апарасаў становіцца зараз асноўнай задачай кожнага сьвіназадоўчага саўгасу. Каб выканаць прамфінпляк 1932 г., трэба дасягнуць захаваньня ад кожнага апарасу ня менш 5,8 таварных сьвіней.

Зараз па саўгасах просту Сьвінавода, пачынаючы з 20-га студзеня, з кожнай дэкадай усё павялічваецца. Калі па 20-га студзеня адыход складаў 13.2 проц., на 1-га лютага 18 проц., дык на 10-га лютага ён ужо дасягнуў 24 проц. У пасадных саўгасах, як «Бельнічы», «Пачаевічы», «Чэрыкаў», «Самотэвічы» імя 14 партызан адыход парасят за дэкаду (з 1-га па 10-та лютага) дасягае гаспэльных разьмераў і дасягае ад 38 да 50 проц.

Дзе прычыны такога высокага пропанту адыходу парасят? Адказам на гэта пытаньне можа паслужыць практыка саўгасу «Насовічы», дзе ў студзені адышло 250 штук, прыплод-жа за тыя месяц дасягнуў 19 штук. У сьвінарніках не захоўваліся элементарныя правілы догляду і ўтрыманьня. Такія факты не адзіночныя. Нярэдка маладняк утрымліваецца ў сырых, брудных сьвінарніках, дзе адсутнічае вэнтыляцыя і сьвежае паветра, сьвіньні не выгуляюцца на прагулку.

Між тым у саўгасах ёсьць усе магчымасьці скарацець адыход маладняка да мінімуму. Гэта мы бачым на вольнае лепшых саўгасаў, як імя Сталіна (Бойтагорскі раён), дзе адыход складае 6.4 проц., у саўгасе «Калініна» (Чырвонаармейскі раён) — 10.4 проц. і «Замошша» (Плешчаніцкі раён) — 11.8 проц.

Рашаючае значэньне для разгортваньня сацыялістычнай сьвіназадоўлі мае правільная арганізацыя працы ў сьвіназадоўчых цэхах і ліквідацыя абязьлюдзьвя ў дагледзе. Для гэтага трэба за брыгады сьвінароў і дажкурных прыцягваць групу вясковых і пасоўных жанчын, якія знаходзяцца пад кіраўніцтвам брыгады да перавачы прыплоду ў аборачны цэх. Такія чыны, як і тая-ж брыгада лагадае за маткамі ў часе іх цяжарнасьці, за матчынай і парасятамі ў пасоўным прыплоду і за адгулкамі парасятамі ад 2 да 4 месяцаў.

Брыгада павінна поўнасьцю адказваць за дочкі, утрыманьне і прырост стада. Зарплату кожнага сьвінара, зоатэхніка, ветдактара трэба паставіць у залежнасьць ад колькасьці і якасьці росту стада, гадоўлі маладняка і выхаду таварнай прадукцыі.

Прамфінплян 1932 г. трэба давесьці да кожнага сьвінара. Толькі ўдзяленьнем у барацьбу за захаваньне маладняка ўсёй масы рабочых саўгасу, толькі шчырэйшым алкыцьцяўленьнем і ўкараненьнем у практыку работы 6 умоў тав. Сталіна, сьвіназадоўчыя саўгасы здолеюць выканаць пастаўленыя перад іх задачы ў чацвертым, заключным годзе пяцігодкі.

Выканаць абавязацельствы

БАРЫСАЎ. (Наш кар.)

Саўгас «Палешкі»—адзін з буйнейшых у БССР, павінен у гэтым годзе даць пралетарскім прыгарам сотні тон мяса.

Былое кіраўніцтва саўгасу не спраўлялася з ускладзенымі на яго задачамі. Праца ў гаспадарцы была арганізавана вельмі дрэнна. У сьвінарнічным цэху была абзялічка і ўдзяленьнем. Кармленьне сьвіней праводзілася не па вызначаных нормах і ня ў вызначаны час, а як і калі ўздумаецца. Адыход маладняка ў мінулым годзе дасягаў 50%.

Абнаўленае кіраўніцтва саўгасу ў асобе работы пакінула 6 сталінскіх удараў перагоні, зьвернула асаблівую ўвагу на выкананьне якасных показальнікаў. Сьвінары пераведзены на вызелька - прэміяльную аплату. Усё стада разьбіта на групы, для кожнай групы вызначаны агобны кармы рацыёна. Паладжана дасканалы ўлік прыросту стада.

Намёк пасобныя цэхамі рэгулярна сацыялістычнае спаборніцтва. Сьвінары ўзялі на сябе абавязак дабіцца захаваньня 90% маладняка і павялічэньня яго вагі ня менш чым на 7 кг. у месяц.

Студзень ужо даў некаторы пералом у рабоце саўгасу. Калі раньш выхад парасят дасягаў да 50%, дык зараз ён зьніжэўся да 17.

Кэйдзін.

За 3.500 таварных сьвіней

Саўгас «Новы Заўкі», Чэрыкоўскага раёну, пачаў быў да пачатку 1932 г. мець 900 сьвіноматак. 588 таварных сьвіней паўнасьцю быў саўгас здаць дзяржаве. На справе-ж плян камплектаваньня сьвіпога стада выканан на 63 проц. Заданьне па здачы таварнай прадукцыі выканана ўсяго на 30 проц.

Дырэктар саўгасу лічыў сьвінагадоўлю другарадная справай. Аб тым, што гэта іменна так, сьвідчыць той факт, што на сьвінарніку пасылаў самых горшых рабочых. У сьвінарніках не захоўваліся элементарныя правілы арганізацыі працы, як прыкладнае поўнае групы сьвіней да сьвінароў, своечасовае кармленьне і г. д.). У выніку дрэннага догляду—адыход парасят складаў калі 70-75 проц.

Пасобныя члены партыі ня толькі не паказваюць узорных прыкладаў у рабоце, а наадварот знаходзяцца ў палоне рэакцыі тэндэнцый здэталі частка рабочых. Напрыклад, член партыі Мураніка доўгі час вядзе барацьбу з дырэкцыяй за тое, каб рабочым дазволілі трымаць у сябе сьвіней. Партыйная ячэйка адносіцца прыміріўча да гэтых апартуністычных настроў і ня дае ім адпору.

У чацвертым, заключным годзе пяцігодкі саўгас павінен здаць дзяржаве 3.500 таварных сьвіней. Заданьне дадзена значнае, але вусіх рэальнае і магчымае для выкананьня. Для гэтага трэба толькі кардынальна змяніць усю работу ў саўгасе, паладзіўшы [illegible]

ЛІКВІДАВАЦЬ САМАЦЁК У МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ!

РАУНЕНЬНЕ ПА ТУРАЎСКІМ РАЁНЕ, ЯКІ ВЫШАЎ НА ПЕРШАЕ МЕСЦА У БССР

Забясьпечыць нарастаньне тэмпаў

Першы квартал 1932 году ў галіне мабілізацыі сродкаў пачаўся з правядзеньня па ўсіх раёнах фінансавага паходу. Раённыя арганізацыі, якія зразумелі пастаўленыя перад імі задачы і на справе разгарнулі бальшавіцкія метады работы, арганізаваўшы вакол фінпляну шырокую грамадзкасьць, дабіліся значных посьпехаў.

Асабліва паказальнай у гэтых адносінах зьявляецца доказная хвоўка аб мабілізацыі сродкаў на 20 лютага: у апошнія 10 дзён разгарнулася работа на культборы. Тым, дзе фінансавы аператар раёнаў адразу прыступіў да падчэпкі культбору і да зьбіраньня налічных сум, там, дзе вакол гэтага пытаньня правядзена шырокая масава-растлумачальная работа, там новае зьяўленьне ня толькі не дало зьніжэньня агульнага прыросту выкананьня квартальнага фінпляну, а наадварот — нарастаньне тэмпаў.

У першай дэкадзе лютага па першым месцы на БССР ішоў Тураўскі раён. Ён і зараз захаваў першынство, выканаўшы 86,5 проц. квартальнага пляну.

За ім ідуць Мсьціслаўскі — 53,8 проц., Гомальскі — 53,2 проц., Віцебскі — 52,3 проц., Менскі—49,7 проц.

Старобінскі раён, які на 10 лютага быў на трэцім месцы па БССР, зараз, калі ў плян уключыўся культбор, адышоў на чацвертае месца, зьнізіўшы тэмпы ад 62,5 проц. да 53,5 проц. Ня здолеў захаваць другога месца Мазырскі раён, які выканаўшы 49,4 проц. пляну, адступіў да сёмага месца.

На аснове перабудовы фінансавай работы і вырашэньня кіраўніцтва мабілізацыяй сродкаў, павялічэньня тэмпы выкананьня фінпляну Бузьдзінскі раён — 48,2 проц. (перайшоў з 16 месца на 10), Магілеўскі — 47,3 проц. (з 28 на 11 месца), Плешчаніцкі—47,2 проц., (з 37 на 12 месца), Хойніцкі—47 (з 48 на 13 месца).

Чатырэхі раёны зусім ня справіўся з культборам і ідуць заваяваны пазыцыі. Залеж 56 проц. фінпляну на 10 лютага, ён дзе 37,5 проц. на 20-е, адышоўшы да 30 месца.

Адступіў ад передавых пазыцый і Пухавіцкі раён, які скаціўся з 8-га на 28-е месца.

Па-ранейшаму плятуцца ў хвасьце рашкоўскі раёны: Рэчыцкі, Аршанскі, Бабруйскі, Горацкі, Барысаўскі, Шклоўскі і Жлобінскі, якія выканалі ад 30 да 36 проц. квартальнага пляну.

Нічога не зрабілі для фарсіраваньня тэмпаў, ня гледзячы на пагражаючыя лыгрэтыны, і па-ранейшаму зрываюць выкананьне фінпляну раёны: Уваравіцкі, Асьвейскі, Расонскі, Бягомльскі, Лельчыцкі, Стара-Дарожскі, Вушацкі, Веткаўскі, Капыльскі і Гарадоцкі, якія на 20 лютага выканалі менш 30 проц. квартальнага пляну.

Спыняючыся на аналізе паступленьняў пасобных плацяжоў, трэба адзначыць пездавальняючы ход рэалізацыі акцый Трактарацэнтру (29,8 проц.), пазыкаблеваньня на вёсцы (25,6 проц.) і ўцягненьня ўкладчыкаў у ашчадкасы (12,9 проц.).

Арганізацыі, што павінны забясьпечыць прыток сродкаў (Белтрактарацэнтр, Белкалгаспрэмтр, Белкаспасюз, усё яшчэ не развярнуліся і ня прымаюць мер для перабудовы работы.

Стаўцы па самацёк трэба пакласьці канец!

Раённыя арганізацыі павінны ўзяць мабілізацыю сродкаў пад нагляд, уплываць тую работу з падрыхтоўкай да пасеўнай кампаніі, і дабіцца поўнага выкананьня квартальнага фінпляну да 15 сакавіка.

Бондабоўскі

Узяць прылад з гаркамбінату

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). РК КП(б)Б, рэдакцыя «Бальшавіка Барысаўшчыны», райпрафсавет і гарадзкі штаб фінпаходу абвясьцілі з 25 лютага па 5-га сакавіка сацыяльную праверку выкананьня фінпляну па Барысаве і раёне.

На прадпрыемствах Барысаўшчыны фінансавы паход ідзе не ўзварушыў пралетарскую грамадзкасьць, на Бярэзінскім камбінаце, які налічвае 2.081 работніка, падпісай на пазыку ахоплена 1.992 чалавекі на 50 проц. месячнага фонду зарплаты. 139 чал. не ахоплены пазыкай. Укладчыкі ашчадкасы зьяўляецца толькі 900 чал. на 6.400 руб. Асабістым і калектыўным страхаваньнем не ахоплен ні адзін рабочы. Камісія сацыяльнасьці камбінату зусім бязьдзейнічае.

Такое-ж становішча і на заводзе імя Домбаля. Фонд зарплаты—87.000 руб., падпіска аформіена да 60.225 руб.; заданьне па фізычных укладах у памеры 4.800 руб. выканана на 3.080 руб.; калектыўным страхаваньнем ахоплена толькі 300 чал. Узносы дагэтуль не паступілі. Арганізацыі заводу імя Домбаля менш за ўсё ўвагі адводзяць фінансавай рабоце.

На камбінаце «Камінтэрн» пры месячным фондзе зарплаты ў 90.000 р., аформіена падпіскі на пазыку на 69.515 руб., 140 рабочых зусім ня маюць аблігацый. Квартальнае заданьне па ўзнаўленьні ўкладчыкаў у ашчадкасы ў сумі 3.200 руб. выканана на 115 руб.; страхаваньнем не ахоплен ні адзін рабочы. Аб тым, як пастаўлена мабілізацыя сродкаў на «Камінтэрне» гаворыць той абзорчы факт, што больш паловы рабочых на прыкмай ўвазе ў тыражы пазыкі імя «Трэцяга ашчэчча», бо ў шырэйшых буклетарыі загінулі заменальныя талёны. На Бярэзінскім камбінаце не разданы дагэтуль замацальныя талёны на аблігацыі пазыкі «Пагодка за чатыры гады» на 8.000 руб.

З прадпрыемстваў Барысаўшчыны на першых месцы ідзе [illegible], які перавыканаў заданьне па [illegible] пазыкі: месячны фонд зарплаты — 30.000 руб., аформіена падпіскі на 37.000 руб. Квартальнае заданьне па ўдзяленьні ўкладчыкаў у ашчадкасы складае 2.500 руб.; выканута 1.200 руб., або 48 проц. квартальнага пляну.

Прыклад гаркамбінату сьвідчыць аб тым, што там, дзе заваявала арганізацыі па-бальшавіцку зацікавіцца за фінпляк, там дасягнуты поўныя посьпехі.

У баку ад мабілізацыі сродкаў

ПОЛАЦАК (НАШ КАР.). Шлакоўскі сельсавет зьяўляецца адным з самых адсталых сельсаветаў Полаччыны ў галіне мабілізацыі сродкаў. Работнікі сельсавету на могуць адказаць на пытаньне, які процант фінпляну выкананы. Гета сьведчыць аб іх кіраўніцтве фінансавай работай. Ёсьць адлічэньні запазычанасьць па абавязковых і добра ахвотных плацяжох. Калгас імя Крупскай дагэтуль на ўнёс падатку і страхоўку за 1931 год.

Да 15 лютага пайвіна было поступіць 50 проц. культбору, спагнана на 17 по тага толькі 7 проц.

Парт'ячэйка зусім не займаецца пытаньнем мабілізацыі сродкаў. Пастанова аб культборы не абгаворвалася на ячэйцы. Не праведзена масавая работа сярод калгасьнікаў вакол выкананьня абавязковых і добраахвотных плацяжоў.

Зьлёт ударнікаў фінансавага фронту

ДУБРОЎНА. (Белта). Гетымі днямі адбыўся зьлёт ударнікаў фінансавага фронту Дубровенчыны. Зьлёт адзначыў бязьдзейнасьць Бугайоўкага, Целяпінскага, Сяньнаўскага і інш. сельсаветаў, якія зрываюць выкананьне фінпляну. Дубровенскі сельсавет узяў Целяпічы на прамацкі бусір і пазбавіў тупы ўдарную брыгаду.

Лепшым ударнікам фінансавага фронту на зьлёце расцэнены прэміі і пахвалы.

Вучыцца на прыкладзе лепшых

Саўгас «Насовічы» (Гомельскі раён) сустракае масавыя ап

На канфэрэнцыі па „раззбраеньні"

Усеагульнае поўнае раззбраеньне — адзіная гарантыя супроць вайны

Выступленьне тав. ЛІТВІНАВА

ЖЭНЭВА, 25. Генэральная камісія канфэрэнцыі па раззбраеньні прыступіла сёньня да абмеркаваньня дзьвёх унесеных учора рэзалюцый — тав. Літвінавым і Саймонам.

У пачатку насяджэньня з прамовай, выслуханай з вялікай увагай, выступіў тав. Літвінаў.

«Я ня думаў, што мне прыдзецца першым выступіць у камісіі ў сувязі з рэзалюцыяй аб усеагульным і поўным раззбраеньні. Я думаў, што гэта рэзалюцыя лічыцца ўнесенай і ўгрунтаванай заявай, зробленай мной на канфэрэнцыі 11-га лютага і што мне прыдзецца толькі адказваць на магчымыя супярэчнасьці іншых дэлегатаў. Я, аднак, ахвотна іду на заклік, зроблены ўчора ў камісіі аб новым выступленьні на карысьць поўнага раззбраеньня і асаблівае задаволен, што гэты заклік выходзіў ад паважанага прэм'ера Францыі, Тард'е.

Я, аднак, ня маю намеру злоўжываць заклікам і брацьмат часу ў камісіі падрабязным паўтарэньнем усіх тых матываў на карысьць поўнага раззбраеньня, якія я ўжо прывёў на канфэрэнцыі. Я толькі коратка прыпомню іх.

Ці рэальная пагроза вайны?

Асноўныя нашы тэзісы зводзяцца да таго, што пагроза новай вайны цяпер больш рэальная, чым калі-б там ні было (калі наогул можна гаварыць аб пагрозе, калі вайна ўжо вялецца), што новая вайна пагражае чалавецтву большымі жахамі зьнішчэньня, чым калі-б там ні бы, што яна пагражае асаблівымі няпрасьлямі ва ўмовах сучаснага крызісу працоўным, што залачай пня вьяўляецца стварэньне максымальнай бясьпечнасьці супроць вайны і што гэта бясьпечнасьць ня можа быць ажыцьцёўлена іншымі шляхамі, як поўным скасаваньнем узбраеньняў і ўсялякіх іншых ваенных фактараў.

Праўда, савецкая прапанова была ўжо раней адхілена ў падрыхтоўчай камісіі у якой знаходзіліся прадстаўнікі ўсіх буйнейшых і найбольш значных дзяржаў. Мы, тым ня менш, дазваляем сабе зноў паставіць гэтыя прапановы перад канфэрэнцыяй, бо дэлегаты камісіі, між іншым, спасылаліся на абмежаванасьць сваіх поўнамоцтваў, невыстарчальнасьць іх інструкцый і на інш. фармальныя прычыны, на якія паўрад ці можа спасылацца канфэрэнцыя, якая складаецца з прадстаўнікоў амаль усіх існуючых дзяржаў, як членаў, так і ня членаў Лігі нацый, і пры тым прадстаўнікоў найбольш адказных, найбольш кваліфікаваных для прыняцьця самых сур'ёзных рашэньняў. Апрача таго, нашы прапановы зроблены былі пяць год таму назад, а за гэты час, мне здаецца, можна было-б многаму навучыцца на падзеях, што цяпер адбываюцца.

Магчымасьць новай вайны з выстарчальнай відавочнасьцю даказана цяпер тым, што яна ўжо ёсьць, в відавочнасьць не далейшага пашырэньня ці паўтарэньня ў большым маштабе ня можа адмаўлівацца, калі ўлічыць усё больш абвостраныя супярэчнасьці паміж дзяржавамі.

У той час, як рада Лігі палый насылае заклікі да ваючых на Далёкім Усходзе дзяржаў аб спыненьні ваенных дзеяньняў, а дэлегаты на канфэрэнцыі выказваюць свой жаль з прычыны крыкваліцьця на Усходзе,— у той час, паўтараю, некаторыя краіны вольна і адкрыта, за згоды сваіх урадаў, пасылаюць транспарт за транспартам ваеннай амуніцыі ваючым дзяржавам для працягваньня і ўзмацненьня крывапраліцьця.

Ці-ж гэта не даказвае, што міжнародныя супярэчнасьці і інтарэсы, што стаяць за ўзбраеньнямі, за ваенная прамысловасьцю, мацней усялякіх пажаданьняў і рэзалюцый пацыфістаў пасобных гурткоў, груп і нават партый? Ці-ж не даводзіць гэта і таго, што падобнаму стану рэчаў немагчыма пакласьці канец інакш, як поўным зьнішчэньнем узбраеньняў, агульным і поўным раззбраеньнем? Я мог-бы абмежаваць сказанымі ўгрунтаваньне рэзалюцыі аб поўным раззбраеньні і прадставіць іншым дэлегатам указаць, якія, на іх думку, існуюць перашкоды да ажыцьцёўленьня гэтай прапановы. Я баюся, аднак, што тут могуць быць выказаны тыя-ж супярэчнасьці, якія мы чулі ўжо ў падрыхтоўчай камісіі, і мне здаецца, што я з'ясьню генэральнай камісіі час, калі я сам дазволю сабе напомніць ёй гэтыя супярэчнасьці і даныя мною на іх адказы.

Толькі поўнае раззбраеньне забясьпечыць бясьпечнасьць

Я ўжо гаварыў, аб пярэчаньнях фармальнага характару. Да ліку іх трэба таксама аднесьці спасылкі на 8 артыкул статуту Лігі нацый, які абавязвае, нібы, членаў Лігі скараціць свае узбраеньні толькі да ўзроўню, сумяшчальнага з бясьпечнасьцю. Але, уносячы нашы прапановы аб поўным раззбраеньні, мы ня грунтуемся на якіх-небудзь абавязальствах дзяржаў, удзельнікаў канфэрэнцыі і не прад'яўляем ніякіх патрабаваньняў. Мы пытаемся ў іх не аб тым, што яны абавязаны зрабіць, а аб тым, што яны згодны зрабіць, г. зн. ці згодны яны разам з Савецкім Саюзам раззброіцца поўнасьцю, каб выгнаць вайну з міжнароднага ўжытку і каб адмовіцца ад вайны, у якасьці сродку гаспадараньня. Пры гэтым мы ўсім не ігнаруем умову бясьпечнасьці, але мы гаворым, што гэта бясьпечнасьць і бясьпечнасьць для ўсіх краін можа быць дана толькі поўным раззбраеньнем. Але, апрача фармальных, мы чулі ў падрыхтоўчай камісіі і пярэчаньні па сутнасьці.

Нам гаварылі, напрыклад, што нават пры зьнішчэньні пастаянных армій і флёту прыдзецца захаваць пагранічную стражу для барацьбы з кантрабандыстамі, паліцэйскую сілу, пажарныя каманды, лясную ахову, канвойныя каманды і інш., што гэтай узброенай сілы досыць будзе для нападу адных краін на другія. Не палягае сумненьню, што ў выпадку поўнага раззбраеньня немагчыма будзе прадставіць кожнай дзяржаве пад выглядам паліцэйскай, пагранічнай або іншай аховы ставіць сабе на ўласным гледжаньні і без абмеркаваньня тую ці іншую патэнцыяльна ўзброеную сілу і што неабходна будзе абпаведная міжнародная канвэнцыя для ўрэгуляваньня гэтага пытаньня. Такая канвэнцыя, відавочна прадставіць дзьвём суседнім дзяржавам права мець адноўкавую колькасьць аховы па абодвух баках граніцы. Што датычыць паліцыі, дык яна магла-б прадставіць сабою патэнцыяльную армію галькі ў тым выпадку, калі было-б прынята неабходным узброіваць яе кулямётамі, танкамі, артылерыяй, атрутнымі газамі, бомбавозамі і г. д.

Мы, аднак, такой неабходнасьці не прызнаем. Пры пакіданьні-ж паліцыі прысвойнай зброі цяжка мяркаваць, каб якая-небудзь дзяржава магла цалкам мабілізаваць яе і сьцягнуць яе на межы з усіх гарадоў і вёсак, каб кінуць на суседнюю краіну. Мы ведаем, што якая для вайны і пры вядзеньні вайны дзяржава ўзмацняе органы, прызначаныя для падтрыманьня ўнутранага парадку, і ніколі не адважыцца адцягнуць паліцэйскія сілы ад іх прозьба абазьвязку. Паводле такіх-жа мерсаваньняў немагчыма і мабілізацыя лажэйных каманд, відома, не заслугоўе сурёзнага абгаварэньня.

Нам гаварылі таксама, што нават у выпадку зьнішчэньня армій і сучасная зброі людзі на самой прыроде на змогуць адмовіцца ад бойкі, і народы будуць кідацца адзін на другога з самай прымітыўнай зброяй і нават бяцца на кулаках. Але мы думаем, што ваіматлікая пагранічная варты будзе зусім лаялі для адбіцьня падобнага роду атак. Ды і наўрад ці праігрань-б пывілізацыя колькі-небудзь ад таго, калі-б на Далёкім Усходзе, напрыклад, замест абмену знарадамі з цяжкіх гармат і бомбамі з паветра, якія каштуюць жыцьця і маемасьці тысячам чалавек, адбывалася-б цяпер толькі бойка на кулаках.

Прыводзілася нібы і больш сур'ёзнае пярэчаньне. Нам указавалі, што і пасьля поўнага раззбраеньня найбольш індустрыяльна разьвітыя краіны маглі-б стварыць сабе новыя ўзбраеньні і нападзьці на беззбройных суседзяў. Гэта спасыланьне на магчымасьць парушэньня канвэнцыі можа служыць аргументам супроць любой канвэнцыі і супроць канвэнцыі аб абмежаваньні ці скарачэньні ўзбраеньняў. Калі мяркаваць, што адны дзяржавы будуць лёяльна выконваць канвэнцыю, а іншыя ў парушэньне яе патаемна павялічваць устаноўленыя для іх канвэнцыяй узброеныя сілы, дык неаўменна стварыцца пагроза бясьпечнасьці для лёяльных краін.

Калі выходзіць з гэтага, дык немагчыма заключыць ніякая міжнародныя згоды. Я ўжо ўказваў на плянуме канфэрэнцыі, што пры ўсеагульным раззбраеньні кантроль над заклаваньнем канвэнцыі непамерна больш просты і больш эфэктыўны, чым пры скарачэньні ўзбраеньняў. Отварэньне нанава вытворчасьці ваенных матар'ялаў, мабілізацыя вялікіх атрадаў пры адсутнасьці ўсякага вучоту, узбраеньне і экіпіроўка іх заматрабуе вельмі доўгага часу, каб гэта магло прайсьці незаўважаным. Няпрыкметна вы не пабудуеце ня толькі дрэдноўта, але нават і падводнай лодкі, дальнабойных гармат ці самалётаў.

Можна мець горшую металюргічную ці хамічную базу ў краіне, можна ўжадаць большай колькасьцю ці шчыльнасьцю насельніцтва, але для таго, каб гэтыя матэрыяльныя сілы ператварыць ва ўзброеную армію, патрэбны складаныя і прапятыя працэсы, патрэбны добрыя ваенныя кадры, патрэбна вывучка іх, патрэбны значныя тэрміны часу для таго, каб прывесьці ў дзейнасьць складаныя механізмы вайны. Ва ўмовах сучаснай ваеннай тэхнікі толькі сыстэматычна пераналучаныя рэзервісты прадстаўляюць цяпнасьць для армії. Тэхніка застольні рухаецца наперад, што на пачорных аборах прыходзіцца пераналучаць радавых салдатаў, унтер-афіцэраў і нават афіцэраў. Таму, зьнішчэньне вайсковай навіннасьці, поўнае зьнішчэньне вучотных даных для мабілізацыі рашуча зьнішчаць усякую магчымасьць выкарыстаньня арганізаваных мас для ваенных мэтаў у кароткія тэрміны.

Нарэшце, ці-ж сучасныя патэнцыяльныя сілы адноўкавы ва ўсіх дзяржавах? Ці-ж існуе поўнасьць бясьпечнасьці з гэтага пункту гледжаньня? Ці-ж прамыслова-разьвітыя дзяржавы ня могуць у выпадку вайны мабілізацыяй прамысловасьці стварыць сабе валізарную перавагу над сіламі менш прамыслова разьвітых, а тым больш аграрных краін? Ці-ж не відавочна, што разьвіцьцё і пашырэньне існуючай ваеннай прамысловасьці, існуючых ваенных кадраў больш ажыцьцяльна, больш разьвіта, чым стварэньне нанава зьнішчанай ваеннай прамысловасьці ці стварэньне армії з ненавучаных народных мас. Ды і ці магчыма будзе мабілізацыя гэтых мас для ваенных патрэб, калі гэтыя масы ня будуць мець перад сабою ўзброенага праціўніка і ня будуць баяцца нападу з яго боку? Во і цяпер стварэньне армії і мабілізацыя для вайны магчымы толькі пры ўзьдзейнасьці на розум народных мас фіктыўнай ці сапраўднай пагрозай нападу на іх краіну. Пры ўсеагульным раззбраеньні нельга будзе гэтых фікцый стварыць і ўжо таму немагчыма будзе падрыхтоўка да вайны. Нам прадстаўляецца, што па гэтай-жа прычыне неажыцьцяўнімі небясьпекі нібы ў бліжэйшыя гады можна будзе мабілізаваць тых розьвістаў, якія атрымалі вайсковую падрыхтоўку і адукацыю да ўсеагульнага раззбраеньня.

Мы глыбока пераконаны ў тым, што толькі поўнасьць у адсутнасьці ўзбраеньняў, роўнасьць на нулі створыць сапраўдную гарантыю бясьпечнасьці для ўсіх народаў, што гэта пачуцьцё бясьпечнасьці будзе настолькі моцным, што ні ў адной краіне ўрад ня зможа, калі нават захоча, мабілізаваць адны народы для нападу на другія.

Адзіны шлях да міру

Я, здаецца, пералічыў важнейшыя пярэчаньні, якія прыводзіліся ў падрыхтоўчай камісіі супроць поўнага раззбраеньня. Я гатоў дапусьціць магчымасьць новых пярэчаньняў, нявыказаных яшчэ ў падрыхтоўчай камісіі. Мы ахвотна выслухаем іх тут. Мы, аднак, пераконаны ў тым, што якіх-б дэфэкты не маглі быць знойдзены ў прапанаванай намі схэме, перавагі яе поўнасьцю іх перакрываюць. Другой альтэрнатывы няма. Другой гарантыі супроць вайны мы ня бачым. Яе не дае ні скарачэньне ўзбраеньняў, ні тым больш абмежаваньне ўзбраеньняў і зьнішчэньне тых ці іншых сродкаў узбраеньняў.

Дзяржава, якую я маю гонар прадстаўляць, даражыць ня менш, а відавочна больш, сваёй незалежнасьцю, чым іншыя дзяржавы. Яна алічвае патрэбу ў бясьпечнасьці ня меншую, а большую, чым іншыя дзяржавы. Заяваяўшы сабе гераічнымі намаганьнямі салрэўную свабоду, рабочая і сялянне Савецкага Саюзу, пасьля стамляючай сусьветнай вайны, пазнны былі далаткова тры гады ўзброенай рукой абараняць гэту свабоду супроць замахаў на яе знутры і звонку. Пасьля 12 год яны з вялізарным энтузіязмам працуюць над закладваньнем фундаманту новага ладу. Яны ажыцьцявілі вялізарнейшыя эканамічныя плыны, якія ўжо некалькі год таму назад пасьля Савецкім Саюзам, характарызаваліся, як утопія. Яны ведаюць, што парушэньне бясьпечнасьці іх дзяржавы, чужаземнае ўварваньне можа пагражаць зьнішчэньнем пабудаванага імі фундаманту, зьнішчэньнем надзеі на хуткае ажыцьцяўленьне новага ладу.

Тым ня менш, яны-б не алчулі ніякай пагрозы сябе ад зьнішчэньня ўзброеных сіл Савецкага Саюзу пры ўмове зьнішчэньня ўзброеных сіл і іншых дзяржаў. Наадварот, у іх узмацняецца пачуцьцё бясьпечнасьці, і яны ніколі ня будуць баяцца нападу беззбройных народных мас іншых краін, як ведаюць, што Саюз мяркуе з такімі колькасна неарыпмаючымі іх народамі, як кітайскі і індыйскі. Поўнае ўсеагульнае раззбраеньне не стварае небясьпекі і для іншых народаў.

Але, якія-б ня былі адносіны іншых дзяржаў да прапановы аб поўным раззбраеньні савецкі ўрад ня можа прайсьці міма магчымасьці, якую прадстаўляе для яго сучасная сусьветная канфэрэнцыя для пастаноўкі праблемы аб поўным раззбраеньні. Калі не на сучасной канфэрэнцыі, дык дзе-ж гэта праблема можа быць пастаўлена? Галасаваньне па гэтым пытаньні, незалежна ад яго выніку будзе поўна глыбокага гістарычнага значэньня і ня пройдзе бясьсьледна ў гісторыі міжнародных адносін. Вось чаму я дазволю сабе рэкамендаваць вашай увазе і паставіць на ваша абмеркаваньне савецкі праект рэзалюцыі».

ПРАЕКТ РЭЗАЛЮЦЫІ САВЕЦКАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ

ЖЭНЭВА, 24. Праект рэзалюцыі савецкай дэлегацыі, разданы учора членам генэральнай камісіі, гаворыць:

«Захопленыя цьвёрдым імкненьнем да сапраўднага, моцна арганізаванага міру, кіруючыся жаданьнем стварыць рэальную бясьпечнасьць для ўсіх дзяржаў і народаў шляхам папрэджаньня новых войн,

перакананая, што самае існаваньне ўзбраеньняў і іх рэўна выражанае імкненьне да бесьперапыннага росту нямінуча вядуць да міжнародных узброеных канфліктаў, якія вядуць працоўных ад іх мірных занятняў і парадзіцоць шматлікія няшчасьці,

пічачы, што ваенныя расходы, якія прыціскаюць нявыносная цяжкасьцю масы насельніцтва, яшчэ больш узмацняюць сучасны эканамічны крызіс з усімі яго вынікамі, канстатуючы, што дзяржавы, якія канфэрэнцыя прадстаўляе, адмовіліся ад войны, як сродку нацыянальнай палітыкі,

пічачы, што сапраўдным адзіным сродкам сардэйнічаць арганізацыі міру і ўстанаўленьню бясьпечнасьці супроць войны зьяўляецца ўсеагульнае поўнае зьнішчэньне ў найкарацейшы тэрмін усіх узбраеньняў на падставах роўнасьці для ўсіх,

перакананая, што ідэя ўсеагульнага і поўнага раззбраеньня адказвае шчырым імкненьням да міру народных мас, канфэрэнцыя рашае узяць за основу сваіх работ прынцып усеагульнага поўнага раззбраеньня».

КІТАЙЦЫ ЎТРЫМЛІВАЮЦЬ УСЕ ПАЗЫЦЫІ

24-гадзінны бой у раёне Цзянван скончыўся паражэньнем японцаў

ШАНХАЙ, 27. Мяркуючы па ўсіх, якія ёсьць, прасоўваньне японскіх войск за апошні тыдзень цэлесьльні павольна. Поспехі японскіх войск тлумачыцца мала і на ізьне новыя японскія дывізіі, высадка якіх заканчваецца сёньня ноччу, выпадае задача выбіць кітайскія войскі з Шанхайскага раёну. Учора барацьба згуртоўвалася ў раёне прох вёсак — Сяоцзяньяо Щуйцзэцзун і Чжуэйтунь, якія знаходзяцца паміж вёскамі Цзянвань і Мяоцзянцзян. Барацьба абмывалася на працягу ўсяго дня. Японскія войскі ня раз пераходзілі ў наступленьне. Павоцле вестак з кітайскіх крыніц, японскім войскам не ўдалося цкарваць кітайскія лініі, якія знаходзяцца ў раёне паміж вёскамі Цзянвань і Мяоцзянцзян.

Баі не зьмянілі лініі фронту

ПАРЫЖ, 26. Шанхайскі карэспандэнт «Пці Парызьен» паведамляе, што ўчарайшнія баі не зьмянілі лініі цзяньванскага фронту.

Карэспандэнт «Матэн» канстатуе, што незвычайнае супраціўленьне кантонскіх войск паэлектрызавала ваенныя пачуцьці насельніцтва Шанхаю і што панкінскі ўрад, абвешчаны ў здразе і ў патураньні японцам, зараз прымушан ратаваць свой аўтарытэт перад насельніцтвам Кітаю і даць загад войскам прыняць удзел у супраціўленьні японцам.

Паветраная бамбардыроўка кітайскіх гарадоў

ШАНХАЙ, 26. 25 японскіх бомбавозаў і зьнішчальнікаў зьявіліся над Ханчжоу (галоўны горад правінцыі Чжэцзян—чыгуначны пункт на дарозе Шанхай-Ханчжоу). Аэрапляны бамбардыравалі і зруйнавалі Ханчжоускі аэрадром, прывёўшы ў нягодасьць 5 аэрапляноў, якія там знаходзіліся. Учора японскія аэрапляны зьявіліся над Лунхуа (чыгуначны пункт, які злучае Шанхай-Ханчжоускую і Шанхай-Панкінскую чыгункі) і скінулі некалькі бомбаў, зруйнаваўшы сялянскія хаты. Шмат сялян забіта і паранена. Учора Панкін і Чонжу (станцыі на Шанхай-Панкінскай чыгунцы) таксама бамбардыраваліся паветраным флётам. Амэрыканская газэта «Івнінг Пост» паведамляе, што японцы маюць у Шанхаі 200 ваенных самалётаў.

ЗЬВЕРСТВЫ АКУПАНТАЎ У ШАНХАІ

БЭРЛІН, 26. Газэта «Вельт ам абэнд» перадае падрабязнасьці зьверстваў, зробленых японскімі войскамі ў Шанхаі і ў Манчжурыі. Некалькі дзён таму назад з Усуна прыбыў вялікі грузавік, пад сьцягам «Чырвонага крыжу». Грузавік быў нагружан шмат лікімі маленькімі дамавінкамі. З гэтых дамавінак тырчалі канцавіны дзіцячых трупаў. Па словах газэты—ня радкае зьявішча—згвалтаваньне кітайскіх жанчын японскімі маракамі.

***

ШАНХАЙ, 25. У раёне Хонкю працягваецца крывавая расправа японскіх маракоў і ўзброеных японцаў у цывільным над кітайскім насельніцтвам. Колькасьць ахвяр не падаецца вылічэньню. Павоцле вестак, больніцы прымаюць толькі нямногіх кітайцаў, якія маюць вогнястрэльныя і штыхавыя раны. Некалькі кітайскіх жанчын былі знойдзены ў поўбясьпрытомным стане, пакутуючы ад вогнястрэльных і штыхавых ран. Муніцыпальная паліцыяй складзены сьпіс 619 загінуўшых бяз вестак кітайскіх жыхароў Хонкю. Выкрыты сьляды 55 асоб, а аб лёсе астатніх па-ранейшаму нічога невядома. Есьць пэўныя паказаньні, што 338 з ліку загінуўшых бяз вестак былі арыштаваны японскімі ўладамі.

Японскае камандаваньне ў тупіку

ШАНХАЙ, 26. Японскія аэрапляны працягваюць бамбардыроўку вёскі Цзянвань, прабуючы выбіць адтуль кітайскіх снайпэраў, засеўшых у руінах. Камандаваньне пастаўлена ў тупік тым, што, ня гледзячы на жорсткую трохдзённую бамбардыроўку, кітайскія войскі ня выбіты з Цзянвану. Бамбардыроўка Усуна працягваецца. На Чапэйскім вучастку фронту кітайская артылерыя адкрыла агонь па японскім морскім штабе, але не дабілася рэзультатаў. Баопаньскі вучастак фронту таксама быў бамбардыраваны японскімі бомбавозамі, якія разбурылі ўсё ўцалелае ад мінулых бамбардыровак.

ПА ЗАДАНЬНІ ЯПОНЦАЎ БЕЛАГВАРДЗЕЙЦЫ ФАРМУЮЦЬ ВАЙСКОВЫЯ ЧАСЬЦІ

БЭЙПІН. Паводле даных, якія заслугоўваюць поўнага давер'я, КІРАЎНІК БЕЛАГВАРДЗЕЙСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У ХАРБІНЕ ГЕНЭРАЛ КОСЬМІН АТРЫМАЎ АД ЯПОНЦАЎ ЗАДАНЬНЕ СФАРМАВАЦЬ ВАЕННЫЯ ЧАСЬЦІ З БЕЛАГВАРДЗЕЙЦАЎ У СКЛАДЗЕ АДНЭЙ ДЫВІЗІІ.

Фармаваньне гэтай дывізіі адбываецца ў мундзінскай правінцыі пад выглядам рэгістрацыі беспрацоўных праз газэту «Харбінское время». У сярэдзіне лютага з Харбіну выехала некалькі партый, выбраных для гэтай дывізіі белагвардзейцаў. Накіроўваюцца яны ў Мундзін мяжаначнымі групамі, ад 50 да 100 ч.

Камандзірам першай брыгады гэтай дывізіі назначан белагвардзеец Мудрынін, а другой брыгады—белагвардзеец Мадзстаў, белагвардзейская дывізія прызначацца для прарыву ў савецкае прымор'е дзе яна, паводле плану японцаў, павінна разгарнуцца ў выпадку посьпеху ў корпус, частка японскіх войск, па вестках, павінна адначасова ўдарыць з другога канца КУЧ, г. зн. у Забайкальле.

Уся работа па фармаваньні дывізіі працякае ў асобліва канспірацыйнай абстаноўцы. У асобліваści японцы прымаюць меры да занканспіраваньня сувязяй паміж фармуемай дывізіяй і афіцэрскімі японскіх органаў у Манчжурыі, якія арганізуюць гэту дывізію і забясьпечваюць яе ўсім балавым рыштункам.

Аб далейшай рабоце камісіі па чыстцы савецкага апарату

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і калегіі НК РСІ Бел. ад 2-II 1932 г.

Прапанаваць ЦК ЧСА і аналогічным органам гар. і райКК-РСІ на надыходзячы перыяд, у сувязі з задачай пераабудовы работы апарату па-новаму, у далейшай рабоце па чыстцы — кіраванца наступным:

а) Далейшая праверка і чыстка савецкага апарату павінна праходзіць не ў парадку кампаніі, а зьяўляцца штодзённым арганічным мэтадам работы КК-РСІ, прычым у далейшым праводзіць чыстку савецкага апарату толькі на тых вучастках гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, дзе дрэнна выконваюцца заданьні партыі і ўраду і дзе гэта невыкананьне плану пўна сьведчыць аб няпрыгодасьці людзей, аб недахопах структуры і сыстэмы работы даных установы (арганізацыі) частак ня, або асобных групы работнікаў, адказных за выкананьне таго ці іншага заданьня.

Такая ўстаноўка ўжываецца і да ўстаноў, якія ўжо прайшлі чыстку апарату, прычым чыстку працягваць ня толькі пад кутом погляду вытканьня з апарату чужых бюракратычных і няўмелых пасьлядоўна праводзіць палітыку партыі работнікаў, але і ў метах праверкі сыстэмы работы і структуры апарату, перабудовы яго па-новаму.

б) Абавязаць гар. і райКК-РСІ праверку і чыстку праводзіць толькі пры наяўнасьці паказаных у п. «а» даных, а таксама заяў бюро скаргаў, грамадзкіх арганізацый, асобных рабочых, калгасьнікаў, газэт, практыкуючы праверку асобных частак апарату ці груп работнікаў і нават асобных прадпрыемстваў, ужываючы ў гэтых выпадках мэтады прыцягненьня шырокага актыву і шырокай пралетарскай галоснасьці.

в) Прапанаваць ЦК ЧСА гар. і райКК-РСІ пры ўжываньні II-ой і III-ій катэгорыі абавязкова абмяжоўваць поўным тэрмінам (ад году да трох), пасьля якога спагнаньні зьмяшчацца пры ўмовах станоўчых вынікаў аб працы з боку адміністрацыі і грамадзкіх арганізацый.

Для вышучаных раней па II-ой і III-ій катэгорыях — без паказаньня тэрміну — гэты тэрмін павінен быць устаноўлен па іх зьвязках мясцовымі камісіямі па чыстцы, або рай. і гар КК-РСІ.

Абавязаць мясцовыя КК-РСІ, пад адказнасьць старшынь, сваячасова прысылаць усе матар'ялы як справаздачнага характару, так і матар'ялы, якія характарызуюць практыку чысткі і праверкі апарату, усклаўшы таксама на ЦК ЧСА сваячасовую адсылку такіх-жа матар'ялаў у ЦК ЧСА СССР.

Прапанаваць усім кіраўніком апаратных груп наркамату, бюро скаргаў — у дзённы тэрмін прадставіць у ЦК ЧСА свае прапановы аб чыстцы асобных зьвеньняў, або частак цэнтральных апаратаў, якія ня выконваюць дырэктыў партыі і ўраду, або ў выніку работы якіх выявіцца праў, у працы установы.

Прапанаваць гар. і райКК-РСІ (Менск, Гомель, Віцебск, Бабруйск, Мазыр, Магілеў, Ворша, Полацак) арганізаваць камісіі па чыстцы па прынцыпе арганізацыі ЦК ЧСА, але ня менш 7 асоб, з абавязковым членствам у камісіі рабочых і калгасьнікаў, у іншых рэёнах арганізаваць камісіі па меры неабходнасьці самой чысткі апарату, абавязаўшы КК-РСІ прадставіць у дзённы тэрмін у ЦК ЧСА персональны склад камісіі; ЦК ЧСА узмацніць жывое кіраўніцтва шляхам інструктаваньня іх работы, заслухоўваньня даклада ў пасяджэньнях ЦК ЧСА.

Даручыць ЦК ЧСА распрацаваць плян работы, прадставіўшы ў дзённы тэрмін на зацьвярджэньне наркома, або намесьніка, улічыўшы, што на бліжэйшы перыяд ЦК ЧСА павінна зьвярнуць увагу на праверку выкананьня пастаноў камісіі па чыстцы.

СТАРШЫНЯ ЦКК КП(б)Б— НАРКОМ РСІ БЕЛ. КАЛІНІН.

Паведамленьні

— Партыкалегія ЦКК КП(б)Б паведамляе, што з сакавіка, у гор. Менску будзе прапаваць вызнная ПТ ЦКК УсеКП(б) пад старшынствам т. Назарава па разглядзе наступных апеляцыйных парт. спраў: Зайцава М. Т. — Гарадоцкі р., Лебедзева Я. Е.—Ворша, Рышыла Я. С. — Гаўскі р., Пятрушкова Ф. А. — Мазыр, Леонава Н. А. — Гарадоцкі р., Дземчанка Я. Р. — Полацак, Жэўняк Р. А. — Зэмбіна, Шаўцова В. М. — Карма, Якушэнкі К. М. — Гарадок, Кавалёва П. І. — Клімавічы, Лепешна З. Ю. — Гомель, Фарбмана Я. С. — Віцебск, Фейгіна Ф. А. — Дрыбіна, Ермалюціна Я. І. — Ворша, Еротава А. М. — Журавічы, Грыбоўскага П. Х. — Рагачоў, Галоўкіна А. А. — Бабруйск, Сердзюкова М. — Крычаў, Фралкова В. І. — Ворша, Аляксандрава Р. Б. — Ст. Дарогі, Пушчына К. Ф. — Полацак, Ткачэнка Ц. М. — Менск, Гладчанка Е. Я. — Чэрыкаў, Брыко М. Ц. — Асіпавіцкі р., Чмыхава К. А. — Клімавіцкі р., Федарынчыка В. М. — Менск, Хазана М. І. — Ворша, Мігіца Е. П. — Менск, Драздоўскага М. Я. — Менск, Разанава А. Ф. — Менск, Давідовіча П. М. — Горкі, Сьвіткоўскага Р. А., Давідовіча А. І., Марголіна М. Г. Яўка вышэй пералічаных т. т. абавязкова. Праезд за свой кошт.

— Партыкалегія ЦКК КП(б)Б просіць зьявіцца ў ПК або паведаміць свой адрас ці месца працы т. Галаўнёва Рыгора Мітасева (б. Ветрынская арганізацыя). Просьба да ўсіх арганізацый, якія ведаюць месцазнаходжаньня памянёнага таварыша, паведаміць у ПК ЦК КП(б)Б.

— ПК ЦКК КП(б)Б просіць Карчэўскага С. К. (Жлобінскі раён), Нікалаева (Жлобінскі р., стенц. к-т) і Верапа Е. С. зайсьці ў ПК ЦКК КП(б)Б або паведаміць свой адрас. Просьба да ўсіх арганізацый і т. т., якія ведаюць месцазнаходжаньня вышэйпамянёных т. т. паведаміць у ПК ЦКК КП(б)Б.

— Работы ўсебеларускай нарады па кадрах адбываюцца 26—28 лютага ў памяшк. Дому Камасьветы (уваход з вул. Карла Маркса) з 10 да 3 гадз. дня і ад 6 да 9 гадз. веч.

— Менгарком КП(б)Б паведамляе, што 28 лютага, у 6 гадз. веч., у памяшканьні гаркому (3-ці паверх, залі пасяджэньняў) адбудзецца нарада ўсіх сакратароў парткомаў, парткалектываў і ячэек КП(б)Б, дырэктароў прадпрыемстваў, старшынь ФЗМК фабрык і заводаў гор. Менску. Таксама патрэбна зьявіцца на нараду сакратарам парткалектываў чыгуначнага вузлу і старшыням прафкалектываў. З прычыны важнасьці пытаньня, яўка абавязкова і без сказаньня.

— 28 лютага, у 7 гадз. веч., у памяшканьні рэдакцыі «Чырвоная зьмена» (Карла Маркса, 38) рэдакцыя газ. «Чырвоная зьмена» і «Юнгер Арбетэр» склікаюць нараду рэдактароў маладзёжных старонак і камсамольцаў — членаў рэдкалегій. На нараду для абгаворкі пытаньні: 1) Абмен камсамольскіх бліскаў і задачы маладзёжнага друку. 2) Аб хадзе падпісчыкі да абмену (інфармацыі месц). Яўка рэдактароў маладзёжных старонак і камсамольцаў — членаў рэдкалегій—шматтыражак абавязкова.

— Менгарком КП(б)Б склікае 29 лютага, у 6 з пал. гадз. веч., у памяшканьні пасяджэньняў гаркому нараду рэдактароў шматтыражак, насьценгазет прадпрыемстваў г. Менску разам са студэнтамі газэтнага аддзяленьня Камвузу, з паралкам лля: выніскі XVII усесаюзнай партыйнай канферэнцыі і задачы фабрычна-заводзкага друку. Даклад сакратара гаркому КП(б)Б тав. Шпэктарава. Яўка абавязкова і своячасова.

— 29 лютага, у 6 гадз. веч., у памяшканьні Мен. гар. КК КП(б)Б (Энгельса, 28) адбудзецца пасяджэньне парткомкі, на якое выклікаюцца наступныя т. т. Крыгер В. Ф. (Мясакамбінат), Брандлабоўскі (Трактарацэнтр), Уланец (Абкамтрэст), Маневіч В. С. (Ін-т спажкаап.), Сасьвасьцінаў (пляц МБВ), Муць Н. Н. (калгас «Чырв. спецыяліст»), Астапенка П., Гуцьеў Я. Х. (Мітлавоўцкая яч.), Сьпіцын (Камвуз), Лук'яновіч (Трактарацэнтр), Вшаградаў Х. К., Балуга М. П. (БКС), Кіслюк, Клімаў І. Ф. (Камвуз), Пресман (ф-ка «Усход»), Фрэйтаг І. І. (ДШУ), Голуб Р. І. (лімпавая ф-ка), Бадковіч І. А. (саўгас «Новы сьвет»), Зарахін З. М. (зав. «Бальшавік»), Дзьмітрыеў М. А. (Вадаканал), Гайсьцер А. Р. (ф-ка імя 8 сакавіка), Мельцэр (сукняная ф-ка).

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Часопісь ВСНГБ і ЦСПСБ

„ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ"

згодна пастановы ЦК КП(б)Б, пераіменавана на

„ТЭХНІКА Ў МАСЫ"

Першы нумар ілюстраванай навукова-тэхнічнай часопісі „Тэхніка ў масы" выходзіць гэтымі днямі.

Часопісь „Тэхніка ў масы" разьлічана на шырокія колы каманднага складу прамысловасьці, партыйна-камсамольскага прафсаюзнага актыву, кваліфікаваных рабочых, вынаходцаў, рацыяналізатараў, ударнікаў.

Часопісь „Тэхніка ў масы" ставіць перад сабой задачу ўпляў раньня тэхнікі і сапыяністычнай арганізацыі працы на строга навуковай падставе ў прамысловасьці БССР.

Часопісь „Тэхніка ў масы" мае аддзелы:

1. Агульныя; 2. Арганізацыя вытворчасьці; 3. Навука і тэхніка; 4. Абмен вопытам; 5. Кадры; 6. На мясцох; 7. Хроніка; 8. Сярод кніжак; 9. Адказы і кансультацыя.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На год 3 р. 60 к.; на 6 мес. 1 р. 80 к.; на 3 мес. 90 кап.; кошт пасобнага нумару 30 кап.

Падпіска прымаецца толькі праз пошту і паштовыя агенцтвы.

Адрас рэдакцыі: г. Менск, Пляц Волі, № 21/1, ВСНГБ, 2-гі паверх, пакой № 6, тэл. 14-33.

Кіно „Інтэрнацыянал". СЁНЬНЯ І ШТОДЗЕННА

Заменная навідыя ў 7 частках

АПОШНІЯ НАВІНЫ.

У галоўных ролях:

БІБ ДАНІЭЛЬС, НЭЙЛЬ ГАМІЛЬТОН.

Чырвоная Зорка Каса—ад 1 г. дня. Выключны заежны фільм КЕНІГСМАРК

ПРАЛЕТАРЫ Каса—ад 12 г. дня. МОНШ БЭНКС у камэдыі Сапраўдны джэнтльмэн

СПАР